# ПАДПОЛЬНАЯ ГРУПА М. К. СВЕЧКІНАЙ




**Мемарыяльная дошка падпольшчыкам Свечкіным**
**на доме па вул. Свечкіных, 1 у г. Віцебску**

**Перыяд дзеяння:**

верасень 1942 г. – лістапад 1943 г.

**Месца дзеяння:**

Стадыённы пасёлак г. Віцебска

**Колькасць:**

6 чалавек

**Кіраўнікі:**

Свечкіна Марфа (Блахіна)

Дзейнічала ў Віцебску ў межах Стадыённага пасёлка з верасня 1942 г. да лістапада 1943 г. Аб’ядноўвала 6 чалавек. Кіраўнік М. К. Свечкіна (Блахіна). У групу ўваходзілі яе браты Анатоль і Іван, іх жонкі В. С. і А. К. Свечкіны, Н. І. Воранава.

Падтрымлівала цесную сувязь з групамі А. Я. Белахвосцікава, А. І. Кірыленкі (дзейнічала там жа), М. Л. Мурашкі і Р. Ф. Махнова, Т. А. Ламаносенка.

Была звязана з партызанскай брыгадай «Аляксея» (А. Ф. Данукалава). У доме Свечкіных, што ў пасёлку Качаргі, захоўваліся ўзрыўчатка, міны; начавалі і адпачывалі разведчыкі і сувязныя. Дыверсійны матэрыял і літаратуру ад партызан прыносіла 16- гадовая Яўгенія Калабанава. У брыгаду патрыёты рэгулярна дастаўлялі разведданыя, медыкаменты, прыводзілі да партызан ваеннапалонных.

Свечкіных забяспечвалі медыкаментамі ўрачы Р. Ф. Махноў, І. А. Пруднікаў і яго жонка В. А. Санькоўская, медсястра К. Аляксеева і санітарка Ф. Аляксеева. Свечкіны разам з Махновым склалі і перадалі партызанам схему размяшчэння абарончых збудаванняў, зенітных батарэй і дыслакацыі вайсковых часцей у Віцебску.

Марфа, Анатоль і Іван Свечкіны былі арыштаваны і 16 лістапада 1943 г. расстраляны.

У Віцебску імем Свечкіных названа вуліца, на якой яны жылі, на доме № 1 у 1968 г. устаноўлена мемарыяльная дошка. Усе 6 удзельнікаў групы ўзнагароджаны медалём «За адвагу».

**ЛІТАРАТУРА**

1. **Дарафеенка, Н. І.** Падпольная група М. К. Свечкінай / Н. І. Дарафеенка // Памяць: Віцебск : гісторыка-дакументальныя хронікі гарадоў і раёнаў Беларусі : у 2 кн. / рэдкал.: Г. П. Пашкоў (гал. рэд.) [і інш.] ; склад. А. І. Мацяюн ; маст. Э. Э. Жакевіч. – Мінск, 2002. – Кн. 1. – С. 496.

2. **Подпольная** группа Свечкиной М. К. // Витебск : энцикл. справочник / редкол.: И. П. Шамякин (гл. ред.) [и др.]. – Минск, 1988. – С. 294–295.